# Школьная планета

*НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!*

*№ 8 (64) КРАСАВІК 2020*

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*

## Віншуем!

**Удзельніца клуба "Юны журналіст", пастаянны карэспандэнт газеты "Школьная планета" АНАСТАСІЯ БУРАЯ па выніках абласнога этапа рэспубліканскага конкурса юных журналістаў "Ты ў эфіры" атрымала ДЫПЛОМ ІІІ СТУПЕНІ ў намінацыі "Друкаваны матэрыял"**



## Поспех - гэта штодзённая праца над сабой, альбо партрэт сучаснага вучня







Матэрыял чытайце на ст.2-3

# Поспех - гэта штодзённая праца над сабой, альбо партрэт сучаснага вучня

**Чалавек, які трапіў пад уладу ляноты, неарганізаванасці, безадказнасці, не атрымае заслужанага прызнання, павагі, не здолее падняцца на прыступкі поспеху. Толькі праца над сабой, моцнае жаданне вучыцца, барацьба са штодзённым "не хачу", "не буду" могуць мець плён. З кагорты такіх вучняў, якія працуюць, забываючыся пра стому, нашы сённяшнія выпускніцы Вікторыя Лапцёнак і Ганна Лукашык. Спадзяемся, праз месяц яны атрымаюць заслужаныя залатыя медалі як пацвярджэнне выдатнай вучобы, старannасці, дысцыплінаванасці, адказнасці. Менавіта гэтыя якасці дапамаглі вучаніцам дасягнуць поспехаў у вучобе, у шматлікіх алімпіядах і конкурсах. Сёння ж нам хацелася даведацца праз бліц-апытанку, а чым, акрамя вучобы, жывуць дзяўчынкі, чым захапляюцца, што ім падабаецца, пра што яны мараць у свабодны ад вучобы час.**



**ВІКТОРЫЯ ЛАПЦЁНАК:**

**Мае захапленні** – гэта руская мова і літаратура, гісторыя Беларусі, гульня ў шашкі, баскетбол, маляванне, вершаскладанне, пісьменніцтва, чытанне, культурная адукацыя.

**Жыццёвыя мэты**: мне хацелася б атрымаць педагагічную адукацыю, вывучыць некалькі моў на гутарковым узроўні, заняцца вывучэннем паходжання слоў у рускай мове, гісторыі іншых дзяржаў, эвалюцыі розных відаў раслін і жывёл, надрукаваць зборнік вершаў, наведаць як мага больш культурных помнікаў і мерапрыемстваў краіны.

**Мой дэвіз** – «Veni, vidi, vici». Ператвараць мару ў мэту, а мэту – у дасягненне. У першую чаргу заўважаць у людзях прыгожае. Любіць жыццё і заўсёды атрымліваць асалоду ад яго. Заставацца верным свайму сэрцу і думаць халоднай галавой. Шанаваць блізкіх. Цягнуцца да ведаў і культуры, дзяліцца са светам сваёй творчасцю.

Любімы фільм **"Стварыўшая цуд"**

Любімая кніга "**450 градусаў па Фарэнгейту"** Рэя Брэдберы

Любімыя мультфільмы ў дзяцінстве **"Прыгажуня і пачвара", "Папялушка"**

Калі б ты апынулася перад зачыненымі дзвярыма, то куды б вяла дарога за ёй? **Да маёй мары, якая ўрэшце ажыццявілася**

Любімыя колеры **Белы, блакітны, фіялетавы.**

Любімыя кветкі **Рамонкі**

Што чалавеку трэба для шчасця?

**Любімая сям'я, самапавага, любімая справа.**

Пажаданні чытачам нашай газеты: **Няхай гэта гучыць проста, але я шчыра жадаю ўсім шчасця!**



**ГАННА ЛУКАШЫК:**

**Мае захапленні** – гэта вышыўка крыжыкам, гульня на гітары, спевы.

**Жыццёвыя мэты**: стаць добрым лекарам, быць карысным грамадству.

Спадзяюся, у будучыні я змагу паспяхова сумяшчаць сваё асабістае жыццё і прафесійную сферу дзейнасці. У мяне атрымаецца стаць шчаслівым чалавекам, чыё жыццё будзе сагрэта любоўю блізкіх і родных мне людзей, напоўнена незабыўнымі падарожжамі, зносінамі з цікавымі людзьмі, адкрыццямі новага і нязведанага.

Мне хочацца стаць добрым лекарам, які будзе валодаць каштоўным вопытам прафілактыкі і лячэння захворванняў чалавека і ў вышэйшай ступені такімі якасцямі, як міласэрнасць, цярпенне і вытрыманасць, добразычлівасць, суперажыванне, бескарыслівасць і адказнасць.

Любімыя фільмы **тыя, якія могуць паказытаць нервы**

Настольная кніга зараз **Марк Леві "Тыя словы, што мы не сказалі адзін аднаму"**

Любімыя мультфільмы ў дзяцінстве **"Кароль-леў"**

Калі б ты апынулася перад зачыненымі дзвярыма, то куды б вяла дарога за ёй? **Да нечага добрага, таго, што не прычыніць шкоду**

Да спадобы **пунсовы, смарагдавы** колеры

Заварожваюць кветкі **ружы**

Чалавек шчаслівы, калі **родныя людзі побач**

Жадаю чытачам газеты **быць мэтанакіраванымі, ніколі не здавацца перад перашкодамі!**

**Рэдакцыя газеты "Школьная планета" выказвае падзяку кожнаму, хто супрацоўнічаў з намі і прыняў удзел у апытанні!**

**КАЛЁНЦЫЁНАК МАЦВЕЙ пакуль што вучыцца толькі ў 5 класе нашай школы, але яго стараннасць, уседлівасць, цікавасць да школьных прадметаў маюць свае станоўчыя вынікі. У дзённіку часцей за ўсё прыгажэюць выдатныя адзнакі, а ўдзел у прадметных алімпіядах розных узроўняў у гэтым навучальным годзе стаў даволі паспяховым.**



Так, па выніках раённай аілімпіяды ДУА «Інтэлектуальны цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Бярэзінскага раёна» па вучэбным прадмеце «Руская мова» ён атрымаў ганаровае 3 месца. А вось інтэрнэт-алімпіяда сярод вучняў 5 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Мінскай вобласці па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» прынесла Мацвею Дыплом II ступені, па вучэбным прадмеце "Руская мова" хлопчык стаў уладальнікам дыплома III ступені.

Спадзяемся, што пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў, якія дапамагаюць вучню, а таксама пры падтрымцы сваіх родных: таты Васіля Міхайлавіча, сястрычкі Віялеты і, канешне ж, матулі Святланы Фёдараўны Каленцыёнак, нашай школьнай медыцынскай сястры, – наперадзе ў Мацвея яшчэ будуць новыя перамогі, поспех і прызнанне.

Пакуль жа хлопчык марыць пра звычайныя для яго ўзросту рэчы: добра вучыцца, атрымоўваць веды, якія спатрэбяцца ў далейшым, знайсці сапраўдных сяброў. А вось у вольны час любімы занятак хлопчыка – **футбол.**
Любімыя кінематаграфічныя жанры **фантастыка, камедыі**
Кнігі, якія найбольш уразілі Мацвея **“Маленькі аборвыш” Джэймса Грынвуда, “Шпакі” Васілія Бялова**
З задавальненнм гляджу мультфільмы **“Том і Джэры”, “Гравіці Фолз”**
Калі б ты апынуўся перад зачыненымі дзвярыма, то куды б вяла дарога за ёй? **У зямны рай, дзе б усе людзі жылі дружна, вечна, не кралі, не сварыліся, не падманвалі.**
Любімыя колеры **Аранжавы, салатавы, чорны**
Што чалавеку трэба для шчасця? **Каб у сям’і панавалі мір, узаемапавага і дабрабыт**
Пажаданні чытачам нашай газеты: **Здароўя, шчасця, творчых поспехаў, невычарпальнай энергіі, удачы, натхнення і каб шанцавала ва ўсім!**

Між іншым, па выніках інтэрнэт-алімпіяды па вучэбным прадмеце "Руская мова" сярод вучняў 5 - 8 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Мінскай вобласці пераможцай сярод вучняў 6 класаў стала Ермакова Анастасія, сярод вучняў 7 класаў першае месца заваявала Ясікава Дар'я. Уладальніцай дыплома III ступені сярод вучняў 8 класаў стала Радзевіч Аліна. Падрыхтавалі пераможцаў і прызёраў нашы філолагі **Абрамовіч С.В., Аўтуховіч Н.У, Бярнацкая Н.В., Міхалёва Н.С. Віншуем удзельнікаў і настаўнікаў, жадаем далейшых перамог! Будзем сачыць за поспехамі нашых вучняў і абавязкова раскажам пра іх на старонках нашай газеты.**

**Удзельніца клуба “Юны журналіст”, пастаянны карэспандэнт газеты “Школьная планета” АНАСТАСІЯ БУРАЯ, вучаніца 8 класа, па выніках абласнога этапа рэспубліканскага конкурса юных журналістаў "Ты ў эфіры" атрымала ДЫПЛОМ III СТУПЕНІ ў намінацыі "Друкаваны матэрыял".** І гэта невыпадкова.



Насце падабаецца збіраць матэрыял для напісання артыкула, знаходзіць новую і цікавую інфармацыю не толькі для чытачоў, але і для сябе. Аднак, канешне, яе галоўнае захапленне – маляванне. У нашай школе праходзіла выстава яе работ, творчыя працы былі прадстаўлены ў праграме «Дабраранак», на шматлікіх конкурсах. Так зусім нядаўна яе малюнак “З удзячнасцю праз гады” стаў пераможцам раённай анлайн акцыі “Я помню, Я ганаруся”. Крыніца яе натхнення - **музыка**, а любімыя колеры - **фіялетавы, аранжавы, жоўты**, сярод кветак падабаюцца півоні. Любімы мультфільм «**Прастаквашына**», фільм “У метры адзін ад аднаго”. Сярод любімых кніг “Тысяча пацалункаў, якія нельга забыць” Цілі Коул. А вось любімы аўтар Кацярына Вільмонт. Калі б Насця апынулася перад зачыненымі дзвярыма, то гэта дарога за ёй вяла б **у загадкавы свет.** Дзяўчына лічыць што чалавеку трэба для шчасця, **каб у асяроддзі былі толькі добрыя людзі.**

Анастасія жадае ўсім чытачам нашай газеты ў **такі няпросты перыяд ва ўсім свеце заставацца здаровымі і выдатна адпачыць на летніх канікулах!**

**Артыкул, адзначаны Дыпломам III ступені абласнога этапа рэспубліканскага конкурса юных журналістаў "Ты ў эфіры" у намінацыі "Друкаваны матэрыял"**

# На шляху нечаканых адкрыццяў

**Няспешна ўзіраюся ў старыя вуліцы вёскі Жорнаўка, дзе я нарадзілася і жыву, вуліцы і завулкі горада Беразіно, дзе я вучуся, і адчуваю, як дбайна клапоцяцца гаспадары пра ўласныя хаты. Прыгожа пафарбаваныя, прыбраныя старыя драўляныя суседнічаюць з такімі ж памаладзеўшымі сяброўкамі – хатамі, абшытымі сайдынгам ды металапрофілем. Што ж, змяняецца час, змяняемся мы, людзі, новы воблік атрымоўваюць хаты, аздабляюцца, прыгажэюць. Аднак пры гэтым мяне не пакідае адчуванне, што за сучасным выглядам страчваецца нешта сваё беларускае, адметнае…**



Што вы лічыце помнікам архітэктуры ў нашым горадзе? – з такім пытаннем я звярнулася да сваіх аднагодкаў. Большасць апытуемых даволі ўпэўнена назвала дом графоў Патоцкіх. Сапраўды, гэта найбольш вядомы архітэктурны помнік Беразіно, яго культурна-гістарычная разынка. Узнікненне сядзібна-паркавага комплексу звязваюць з імем Ганны Патоцкай-Вансовіч (у дзяв. Скумін-Тышкевіч) – унучатай пляменніцай апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, прадстаўніцай магутнага роду Патоцкіх, якая пакінула досыць цікавыя мемуары пра сябе, высокі свет, вядомых дзеячоў свайго часу Александра I, Напалеона, Т.Касцюшку. На жаль, за апошнія 40 гадоў помнік архітэктуры апынуўся ў аварыйным стане. Пакінуты і занядбаны, ён панура глядзіць на нас праз стагоддзі. Што адкажам мы яму, што зробім дзеля таго, каб захаваць?! У мінулым годзе дзве нашы школьныя даследчыя працы, прысвечаныя сядзібна-паркаваму комплексу, атрымалі 3 дыпломы абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. Вынікам адной з прац стала гульня, дзякуючы якой кожны жадаючы можа выразаць з паперы і склеіць макет сядзібы. Гэта быў добры, удалы захад для захавання памяці пра мінулыя часы, цудоўная спроба абудзіць цікавасць дзяцей і падлеткаў да гісторыі роднага краю ў гульнёвай форме.



А вось сваім пытаннем "Ці лічыце вы звычайную драўляную хату архітэктурнай адметнасцю часу?" я найбольш уражвала і здзіўляла апытуемых, большасць з якіх упэўнена адказвала "Не". Шкада… Вам, старыя драўляныя і на новы лад перароблены хаткі, вынеслі прысуд. Несправядлівы і горкі. А можа, мала, сябры, ведаеце вы родны край? – хацелася мне запытацца.

Яшчэ ў старажытнасці ў часы язычніцтва ў нашых продкаў складваецца ўяўленне аб пабудове хаты як пэўнай сімвалічнай мадэлі сусвету. У хаце, як і ў храме, існаваў дакладны парадак. Кожнае яе акно, куточак, печ, парог, прадметы мэблі мелі сваё непаўторнае прызначэнне. Напрыклад, тры асноўныя ўзроўні хаты (дах, жылая частка і пограб) суадносіліся з трыма сферамі пабудовы свету: вышэйшая сфера – язычніцкі пантэон багоў, сярэдні ярус належыць чалавеку і жывёльнаму свету, а ніжні насяляюць хтанічныя істоты і продкі. На жаль, пры рамонце зашываюцца акенцы ці адтуліны ў форме розных геаметрычных фігур, якія знаходзяцца непасрэдна на трэцім узроўні. Яны ж даюць святло багам і самі сімвалізуць нябеснае святло. Іх знікненне – гэта парушэнне гармоніі светабудовы…

Памятайце гэта: свет вакол нас цікавы сваімі адметнасцямі, дробязямі, з якіх складаецца цэлае. Адчуйце гэта, і, магчыма, ваша ўяўленне пра свет і людзей будзе больш поўным. Даследуйце, вывучайце, вырывайцеся па-за межы звыклай абыдзеннасці да спазнання дзвівоснага свету і новых адкрыццяў на шляху неспазнанага.

***Даследуе і вывучае гісторыю роднага краю Анастасія Бурая***

# Няхай гучыць родная мова, беларускае слова!

**Па выніках завочнага фіналу абласнога этапу рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”** у 4-й узроставай катэгорыі (9-10 класы) **дыплом ІІ ступені** атрымаў **вучань 10 класа** нашай установы адукацыі **Мікіта Сівец.** Усяго ў фінале прынялі ўдзел 114 навучэнцаў 1-10 класаў з 22 раёнаў Мінскай вобласці і г. Жодзіна, якія прыслалі сваё відэавыступленне з чытаннем лепшых твораў беларускай літаратуры. Між іншым, у скарбонцы нашай школы ўжо ёсць Дыплом ІІ ступені: у 2018 годзе па выніках выступлення ў Мінску яго заваяваў наш вучань, сёлетні выпускнік Кірыл Карпаў.

У склад журы конкурсу ўвайшлі: старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Быкава, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомыя паэты і пісьменнікі Рыгор Саланец, Таццяна Дашкевіч і Марыя Кобец, дырэктар выдавецтва для дзяцей “Элбіпрэс” Людміла Ляскоўская, супрацоўнікі Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі.



**Мікіта Сівец**

Мікіта прачытаў верш Уладзіміра Караткевіча “Мова”, які прасякнуты лірызмам, гараччу ад усведамлення магчымай страты роднай мовы, “трапяткой і сіняй, як васілёк, гарачай, як прамень”, якая павінна гучаць, бо без яе, мовы, не патрэбны пісьменніку рай, не патрэбна яму жыццё. Верш быў выбраны невыпадкова, ён адпавядаў заяўленай тэме конкурса: “Беларуская пісьменнасць ад вытокаў да сучаснасці – нацыянальны набытак і гонар”. Акрамя таго, Уладзімір Караткевіч, які нарадзіўся 26 лістапада 1930 года, селёта адзначае юбілей.

**ВІНШУЕМ дыпламанта!**

Удзел у абласным і раённым этапах конкурса прымалі іншыя вучні нашай установы. Гэта **Радзевіч Аліна, Славашэўская Ганна, Анцыпава Дзіяна, Мядзведзева Ангеліна, Лапыцька Дар’я.** Пакуль яны не атрымалі ўзнагароды. Аднак мы ўпэўнены, што іх творчыя пошукі абавязкова знойдуць заслужанае прызнанне.

**УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ**

**МОВА**

Ёсць паданне вякоў,
што разбурыць калісь
Вавілонскую Вежу Адам
І няўмольна сальюцца мовы зямлі
У адну, народную нам.
І мая безвыходна пойдзе у змрок,
У атрутны, як вечнасць, цень,
Трапяткая і сіняя, як васілёк,
Гарачая, як прамень.
Я ні шчасця, ні будучых дзён не жадзён,
Хай пятля, хай памерці ў журбе,
Хай не будзе ні шчасця, ні будучых дзён,
Калі ў іх не будзе цябе.
Сірата па з'едлівай волі багоў,
Гінучы мой карабель,
Хай не будзе світання ў народа майго,
Калі досвіткам здрадзіць цябе.
Ад палеткаў райскіх лёгкай ступой,
Збочу я да пякельных катлоў,
Калі першы жа ангел на мове маёй
Мне не скажа: «Братка, здароў».
І няхай да мяне не прыйдзе вясна,
Песня, шчасце, каханне, спакой, —
Ўсё адно не змяняю твой чорны праснак
На атруту пшаніцы чужой.
Ты мой ясны хлеб і каханы май,
Песня продкаў, нашчадкаў палі,
Без цябе, не з табой — не патрэбен мне рай
На душы. Ў небясі. На зямлі.



**Уладзімір Караткевіч**

**Убачыць відэаролік з выступленнем фіналіста завочнага этапа конкурса Мікіты Сіўца можна па спасылцы:**

https://drive.google.com/open?id=1Ckao3F0M8ZehhU-yWOgrVNBCnNdB0Q-S

# «Мы супраць алкаголю і наркотыкаў"

**Пад такой назвай з 20 па 30 красавіка 2020 года была праведзена міжведамасная прафілактычная акцыя, мэта якой: прафілактыка спажывання наркатычных сродкаў, алкагольных, слабаалкагольных напояў ці піва, некурыльных тытунёвых вырабаў непаўналетнімі, выхавання асноў здаровага ладу жыцця, павышэння дасведчанасці падлеткаў і іх законных прадстаўнікоў пра дрэнны ўплыў вышэйназваных рэчываў на арганізм.**

У рамках акцыі былі праведзены прафілактычныя і інфармацыйна-асветніцкія мерапрыемствы. Педагогам-псіхолагам Кузінай А.Ю. праведзена анкетаванне сярод навучэнцаў 9-х класаў «Стаўленне да алкаголю». У ім прынялі ўдзел 35 вучняў. Былі атрыманы наступныя даныя: 9 «А» клас - 100% (6 чалавек) паказалі адсутнасць псіхалагічнай схільнасці да алкагалізацыі. 9 «Б» клас - 100% (15 чалавек) паказалі адсутнасць псіхалагічнай схільнасці да алкагалізацыі. 9 "В" клас - 100% (14 чалавек) паказалі адсутнасць псіхалагічнай схільнасці да алкагалізацыі.

У перыяд акцыі ў рамках класных гадзін (згодна з графікам правядзення класных гадзін ва ўстанове адукацыі) былі праведзены з вучнямі наступныя мерапрыемствы: пазнавальная гульня «Злыя чараўнікі – алкаголь і наркотыкі» (1-4 класы), круглы стол "Алкаголь і яго наступствы на арганізм. Усё ў тваіх руках...» (5-6 класы), эстафета меркаванняў «Тры прыступкі, якія вядуць уніз» (7-8 класы), круглы стол «Піва і падлеткавы алкагалізм (9 класы), - дзелавая гульня "Скажы «Не» алкаголю" (9 клас), круглы стол "Алкаголь і поспех – несумяшчальныя" (10 класы), круглы стол "Падлетак і алкаголь. Сацыяльныя наступствы алкагалізму" (11 класы).

У рамках класных гадзін класнымі кіраўнікамі была прадастаўлена інфармацыя навучэнцам аб наступствах спажывання алкагольных, слабаалкагольных напояў і піва, абмеркаваныя пытанні «Да каго звяртацца па дапамогу ў складанай жыццёвай сітуацыі?», «Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць непаўналетніх».





На другім паверсе новага корпуса дэманстраваліся сацыяльныя ролікі: «Небяспечнае апусканне» (для вучняў 1-4 класаў і 5-6 класаў), «Удар па печані» для навучэнцаў 7-8 класаў, «Смяротная вечарынка» для вучняў 9-11 класаў.

22 красавіка ва ўстанове адукацыі была арганізавана лекцыя-гутарка «Шкода алкаголю на падлеткавы арганізм» для навучэнцаў 9-х класаў са школьнай медсястрой Каленцыёнак С.Ф., якая на распавяла навучэнцам, як алкаголь уплывае на дзіцячы арганізм. У спалучэнні з курэннем выяўляецца ў эфекце ўзаемаўзмацнення. Згодна з інфармацыяй пра шкоду алкаголю рызыка з'яўлення ракавых пухлін у лёгкіх, гартані, у выпівох-курцоў вышэй у 7-9 разоў, чым у тых, хто не курыць; у алкаголікаў – вышэй у 5-6 разоў, чым у непітушчых людзей. Пры спалучэнні дзвюх шкодных звычак злаякасныя пухліны могуць узнікаць у 40% выпадкаў. Выключаючы хоць бы адзін фактар, рызыка значна зніжаецца. Спалучаючы алкаголь з наркотыкамі, чалавек душыць у арганізме рэфлексы і важныя функцыі. Нават пры малых дозах спіртнога і наркотыку могуць быць парушаныя дыхальныя функцыі. У стане ап'янення чалавек не здольны кантраляваць дозу прыманага наркотыку, а спіртное ўзмацняе эфект нават ад малой дозы наркатычнага рэчыва. Таму шкода ад алкаголю і наркотыкаў перарастае ў смяротную пагрозу для жыцця.



Святлана Фёдараўна падкрэсліла, што піўны алкагалізм не менш небяспечны, чым залежнасць ад моцных напояў. Многія бацькі не лічаць лёгкую выпіўку чымсьці небяспечным. Аднак нават разавае ўжыванне соладу мае свае негатыўныя наступствы для дзіцячага арганізма.

Піўны алкагалізм сярод моладзі набывае характар эпідэміі. Медсястра распавяла, што спажыванне піва дзецьмі і моладдзю спрыяе развіццю розных захворванняў, асабліва падкрэсліла, што піўны алкагалізм і наогул алкагалізм згубна ўплывае на малады арганізм дзяўчыны. У ходзе мерапрыемства быў прадэманстраваны відэафільм «Шкода алкаголю. Погляд знутры».

Дырэктар установы адукацыі Абрамовіч С.В. нагадала вучням аб адміністрацыйнай адказнасці за распіццё спіртных напояў, за з'яўленне ў стане алкагольнага ап'янення ў грамадскіх месцах.




З вучнямі 8 “Б” класа адбылася сустрэча-дыялог «Хрысціянскі погляд на праблему алкагольнай і наркатычнай залежнасцяў» з настаяцелем храма Праабражэння Гасподняга са святаром Васіліем З непаўналетнімі былі абмеркаваныя агульнахрысціянскія каштоўнасці, небяспека ўзнікнення залежнасці ад алкаголю і наркотыкаў.

З навучэнцамі 8 А класа адбылася сустрэча з медыцынскай сястрой школы Каленцыёнак С.Ф. «Уплыў алкаголю і наркотыкаў на арганізм падлеткаў». У ходзе гутаркі хлопцы паглядзелі відэаролік па тэме і пагаварылі аб тым, як хутка надыходзіць алкагольная залежнасць і якое згубны ўплыў аказвае алкаголь на ўсе органы маладога арганізма. Хлопцы разумеюць, што алкагольная залежнасць ператварае чалавека не толькі ў фізічную разваліну, але і разбурае асобу чалавека.

1 мая адбыўся велапрабег у рамках рэспубліканскай героіка-патрыятычнай акцыі "Вялікай Перамозе - 75!» з удзелам вучняў 8 класаў, вучняў, з якімі праводзіцца ІПР, вучняў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, педагогаў нашай установы адукацыі і работнікаў культуры

Удзельнікі велапрабега ўсклалі кветкі да помніка загінулым салдатам, і хочацца верыць задумаліся на некалькі хвілін пра тое, якім гераічным і мужным было жыццё і смерць салдат.

На базе ТЦ «Юнацтва» школьнікі прынялі ўдзел у спартыўных спаборніцтвах, пераадоленні паласы перашкод. Папоўніць сілы дапамог смачны абед на свежым паветры.

На працягу акцыі службай СППС праводзілася індывідуальнае псіхалагічны і прававое кансультаванне з дапамогай Інтэрнэт-сувязі і мабільнай сувязі з законнымі прадстаўнікамі вучняў, схільных да ўжывання спіртных напояў, на тэму «Алкаголь у сям'і».

Інфармацыя аб правядзенні акцыі “Мы супраць алкаголю і наркотыкаў” была размешчана на інфармацыйных стэндах і сайце ўстановы адукацыі.



**Матэрыял падрыхтавала**
**І.М.Бародзіч**

# "Чарнобыль. Захоўваючы памяць..."

Пад такой назвай у рамках дэкады грамадска-патрыятычных спраў для вучняў устаноў адукацыі прайшлі мерапрыемствы, асноўнай мэтай якіх было фарміраванне ў вучняў культуры беражлівых адносін да гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны краіны праз прыцягненне іх увагі да трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, а таксама тлумачэнне ролі дзяржавы ў вырашэнні комплекснай задачы па рэабілітацыі і адраджэнню пацярпелых тэрыторый.





Адбыліся тэматычныя класныя гадзіны: «Беларусь сёння. Чарнобыльская трагедыя - боль і смутак», «Дваццаць секунд, якія ўзрушылі свет», «Чарнобыль у сэрцы і памяці народа», «Чарнобыль: трагедыя, подзвіг, папярэджанне»; кінавідэалекторый з праглядам фільмаў «Чарнобыль – хроніка цяжкіх тыдняў», «Звон Чарнобыля»; урок памяці «Незагойная рана Беларусі»; інфармацыйна-пазнавальныя праграмы: «Памяці Чарнобыля», «Атамная трагедыя XX стагоддзя», «Скрозь попел Чарнобыля» і інш.



## Каляндар знамянальных і памятных дат

## МАЙ

**1** – 435 гадоў з дня нараджэння Соф'і Слуцкай, рэлігійнай дзеячкі, асветніцы, беларускай праваслаўнай святой

**9** – 75 гадоў з часу заканчэння Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., дзень Перамогі

**9** – 90 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Сямёнавіча Цэдрыка, ураджэнца Бярэзінскага р-на, вучонага фізіка і педагога, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, заслужанага работніка вышэйшай школы Беларусі, аўтара першага на беларускай мове "Курса агульнай фізікі: цеплыня і малекулярная фізіка"



М.С.Цэдрык

**24** – 80 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Бродскага, паэта, драматурга, перакладчыка, Нобелеўскага лаўрэата

**24** – 115 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Шолахава, рускага пісьменніка і кінасцэнарыста, журналіста, Нобелеўскага лаўрэата


ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба "Юны журналіст":
Бурая Анастасія, Губчэўская Кацярына, Лукашэвіч-Рыбачонак Лізавета, Морская Яна, Рафальская Аляксандра, Радзевіч Аліна і інш.